# АКСІЯЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ДЭАНТАЛАГІЧНЫЯ ДЫЛЕМЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ЖУРНАЛІСЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Т. У. Падаляк***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tatsiana_pd@mail.ru*

Укараненне найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій ва ўсе сферы дзейнасці абумовіла з’яўленне новых аксіёлага-дэанталагічных праблем, маральных дылем і дыскусійных пытанняў медыясферы. Гэта патрабуе ўзважанай рэфлексіі адносна абнаўлення і ўдасканалення прафесійных установак, прававых норм і этычных прынцыпаў журналістыкі.

***Ключавыя словы:*** журналістыка; інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі; аксіялогія; дэанталогія; медыяадукацыя; сацыяльная адказнасць.

# АКСИОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ И ДЕОНТОЛОГИЧЕСКИЕ ДИЛЕММЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ЖУРНАЛИСТСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

***Т. В. Подоляк***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*tatsiana_pd@mail.ru*

Внедрение новейших информационно-коммуникационных технологий во все сферы деятельности обусловило появление новых аксиолого-деонтологических проблем, нравственных дилемм и дискуссионных вопросов медиасферы. Это требует взвешенной рефлексии относительно обновления и совершенствования профессиональных установок, правовых норм и этических принципов журналистики.

***Ключевые слова:*** журналистика; информационно-коммуникационные технологии; аксиология; деонтология; медиаобразование; социальная ответственность.

Імклівы тэхналагічны прарыў XXI ст., укараненне найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) ва ўсе сферы дзейнасці, у тым ліку ў журналістыку, абумовілі з'яўленне новых аксіёлага-дэанталагічных праблем, этычных дылем і дыскусійных пытанняў медыясферы. Гэта патрабуе ўзважанай рэфлексіі адносна абнаўлення і ўдасканалення прафесійных установак, метадалагічных стратэгій рэдакцыйнай практыкі, глыбокага аналізу магчымых наступстваў распаўсюджвання ІКТ з мэтай захавання балансу паміж развіццём тэхналогій і абаронай інтарэсаў грамадзян.

Прынцыпова новыя камунікацыйныя і лічбавыя алгарытмы сучаснай медыядзейнасці носяць не толькі канструктыўны, але і дэструктыўны характар. Дакладнасць, аб'ектыўнасць, сацыяльная адказнасць – фундаментальныя, сутнасныя асновы журналістыкі – нярэдка ігнаруюцца з прычыны культывавання спажывецкага стаўлення да факта як да прадмета куплі-продажу. У гэтых умовах неабходна канцэптуалізацыя аксіёлага-дэанталагічнай парадыгмы сучаснай журналістыкі як найважнейшага сацыякультурнага інстытута эпохі дыгіталізацыі, сферы прафесійнай дзейнасці і формы медыйнай творчасці на базе сістэмнага даследавання механізмаў вытворчасці і распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі.

«У вялікім патоку інфармацыі часта вельмі складана вылучыць ісціну і адкінуць хлусню» [1, с. 3], – справядліва адзначаюць аўтары кнігі «Фэйкавыя навіны: інфармацыйная містыфікацыя» С. Распопава і А. Богдан. Яны падкрэсліваюць, што наўмыснае «выкарыстанне недакладнай інфармацыі было гістарычна непадзельным элементам у станаўленні журналісцкай справы, але з развіццём тэхнікі і новых тэхналогій маштабы і эфекты распаўсюджвання фэйкаў узраслі ў разы» [1, с. 109]. Можна пагадзіцца з навукоўцамі: праблема дакладнасці стане галоўным выклікам журналістыкі будучыні, бо ўжо сёння фэйкі з'яўляюцца своеасаблівым трэндам. І з кожным годам фальшывыя навіны як медыяз'явы становяцца ўсё больш мудрагелістымі. У сувязі з гэтым расійскі даследчык С. Распопава асаблівую ўвагу звяртае на фактчэкінг – «этыка-тэхналагічны стандарт, які ўключае сістэму патрабаванняў да атрымання, стварэння і распаўсюджвання інфармацыі. Гэтыя патрабаванні ўяўляюць сабой ядро працы журналіста, якое складаецца з сістэмы тэхналагічных правіл, этычных прынцыпаў, маралі прафесійнай супольнасці» [2, с. 94–95]. Беларускі даследчык І. Каралёў, займаючыся праблемай павышэння эфектыўнасці праверкі інфармацыі

як асновы прадухілення распаўсюджвання недакладных звестак, выяўляе спецыфіку практык верыфікацыі і рэдакцыйнага фактчэкінгу, асаблівасці функцыянавання сучаснага інструментарыя для праверкі інфармацыі ва ўмовах інтэнсіўнага развіцця ІКТ і распаўсюджвання ў медыясферы недакладных навін, прапануе сістэматызацыю сродкаў і метадаў верыфікацыі візуальнага медыякантэнту, распрацоўку алгарытму верыфікацыі інфармацыі як рэгламентаванай паслядоўнасці дзеянняў па аналізе сапраўднасці медыякантэнту [3].

Звернем увагу, што актуальная праблематыка даследуецца не толькі вучонымі і медыяэкспертамі, але і журналістамі. Яны адзначаюць асаблівую ролю сацыяльных сетак у генерацыі мэдыякантэнту, нярэдка «фэйкавага і хайповага». Так, у артыкуле «Стаўка на падсвядомасць» А. Несцераў канстатуе: «Што датычыць фэйкаў у сацсетках, то гэта адвечныя спадарожнікі адзін аднаго». Усерасійскі міжведамасны цэнтр кампетэнцый у сферы інтэрнэт-камунікацый «Дыялог» падкрэслівае, што найбольшая колькасць фэйкаў фіксуецца ў мэсанджары Telegram. У лістападзе 2023 г. у Маскве прайшоў форум «Дыялог аб фэйках», дзе паведамлялася: доля фэйкавых публікацый на пляцоўцы Telegram у 2023 г. у параўнанні з 2022-м павялічылася на 90,6%: «Лідзіруючай механікай стварэння фэйкаў застаецца “наўмысная дэзінфармацыя”.Назіраецца таксама паступовы рост колькасці такіх паведамленняў, створаных з дапамогай сродкаў сінтэзавання кантэнту штучным інтэлектам (ШІ). Па прагнозах даследчыкаў, сацсеткі таксама будуць змушаныя шукаць баланс паміж аўтэнтычнасцю інфармацыі і прадуктам, які створаны з дапамогай штучнага інтэлекту. Карыстальнікам давядзецца складана: ШІ цяпер на ўздыме, і адрозніць прадукт мазгавой дзейнасці рэальных людзей ад згенераванага сіламі машын усё цяжэй» («Беларусь сегодня», 21 снежня 2023 г.).

Сітуацыя ў сродках масавай інфармацыі істотна ўскладніла працэс прафесійна-этычнага самавызначэння маладога пакалення журналістаў, фарміравання маральнай дамінанты творчай дзейнасці, таму аксіёлага-дэанталагічны падыход у медыяадукацыі павінен быць франтальным. Актуалізуецца задача падрыхтоўкі спецыялістаў, якія не толькі дасканала валодаюць эмпірычнымі метадамі пазнання рэчаіснасці, асноўнымі прыёмамі журналісцкага даследавання, але маюць устойлівыя светапоглядныя ўстаноўкі, развітае пачуццё маральнай і сацыяльнай адказнасці за сваю дзейнасць. Гэтаму садзейнічае навучальная дысцыпліна «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі», якая выкладаецца

на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта для навучэнцаў магістратуры. У сучасным свеце важна адэкватна ацэньваць медыякантэнт, фарміраваць актуальныя ўяўленні аб каштоўнасным змесце медыясферы, выкарыстоўваць карэктныя метады аналізу журналісцкай інфармацыі, вызначаць абгрунтаваную методыку ўстанаўлення прафесійных кантактаў, вядзення дыскусіі, палемікі, дыялога і палілога пры вырашэнні аксіялагічных і дэанталагічных дылем.

Даследчык Л. Свіціч у манаграфіі «Актуальныя праблемы сучаснай навукі і журналістыка» справядліва зазначае: «Журналізм ператвараецца ў агульнадаступную, адкрытую больш чым калі-небудзь у мінулым, прафесію. Журналізм можа страціць сваё былое значэнне ў сувязі з нашэсцем непрафесіяналаў, у сувязі з неабсяжнасцю поля карыстальнікаў глабальных сетак. Але, з іншага боку, менавіта з-за гэтай неабсяжнасці інфармацыйных рэсурсаў і суб'ектаў інфармацыйнай дзейнасці прафесія журналіста, магчыма, набудзе яшчэ большую вагу, бо заўсёды патрэбныя навігатары, каардынатары, лоцманы ў моры інфармацыі. Журналісты будуць адыгрываць (і ўжо іграюць) ролю компаса, даведніка, медыятара, які адбірае, аналізуе і кампануе найважнейшыя, актуальныя паведамленні ў бязмежным полі глабальнай інфармацыі» [4, с. 120]. Каб адыгрываць ролю своеасаблівага компаса ў моры інфармацыі, неабходны не толькі прафесійныя, але і светапоглядныя, аксіёлага-дэанталагічныя падставы.

Развіццё інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій садзейнічае мадэрнізацыі форм і метадаў журналісцкай дзейнасці, узнікненню новых медыйных калізій і прэцэдэнтаў «на мяжы». Усё часцей інфармацыя становіцца сродкам маніпулявання свядомасцю медыяаўдыторыі. Ад узроўня аксіёлага-дэанталагічнай сталасці журналіста залежыць ступень адэкватнасці адлюстравання сацыяльнай практыкі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Распопова С. С.*, *Богдан Е. Н.* Фейковые новости: Информационная мистификация. Москва: Аспект Пресс, 2018. 112 с.
2. *Распопова С. С.* Прикладная этика журналиста. Москва: ФЛИНТА, 2021. 260 с.
3. *Королёв И. А.* Верификация информации в журналистике: автореф. дис. канд. филологич. наук : 10.01.10 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2023. 24 с.
4. *Свитич Л. Г.* Актуальные проблемы современной науки и журналистика. 2-е изд., испр. и доп. Москва: Юрайт, 2020. 205 с.